*УДК 656.072.51:656.073.51(476-25)«1991/2001»*

# МІНСКАЯ РЭГІЯНАЛЬНАЯ МЫТНЯ: СТВАРЭННЕ І ТРАНСФАРМАЦЫІ (1991–2001)

*В. А. АСТРОГА*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

На падставе шырокага кола крыніц ведамаснага архіва Мінскай рэгіянальнай мытні і публікацый аналізуецца маладаследаваная старонка ў айчыннай гістарыяграфіі мытнай службы Беларусі – гісторыя стварэння і трансфармацый Мінскай рэгіянальнай мытні ў 1991–2001 гг. Вызначаны асаблівасці і этапы яе дзейнасці ў разглядаемы перыяд, паказана трансфармацыя арганізацыйнай структуры мытні, вывучана эвалюцыя асноўных кірункаў яе працы, ахарактарызавана дзейнасць начальнікаў мытні. Пададзены найбольш яркія прыклады функцыянавання мытні як галоўнай экперыментальнай пляцоўкі мытнай службы краіны. Зроблена выснова аб важнай ролі Мінскай рэгіянальнай мытні ў сістэме мытных органаў Рэспублікі Беларусь.

***Ключавыя словы***: Рэспубліка Беларусь, мытная служба, Мінская рэгіянальная мытня, мытня, мытнікі, трансфармацыя, арганізацыйная структура, пункт мытнага афармлення, барацьба з кантрабандай, канфіскаваныя тавары, пераможца спаборніцтва.

**Образец цитирования**:
Астрога, В. А. Мінская рэгіянальная мытня: стварэнне і трансфармацыі (1991–2001) / В. А. Астрога // Граница и пограничье. – 2023. – № 1 (3). – С. 45–52.

**For citation**:
Astroha, V. A. Minsk regional customs: creation and transformation (1991–2001). Border and Frontier. 2023. No. 1 (3). P. 45–52. Belarusian.

**Автор**:
***Астрога Віктар Аляксандравіч*** – доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры мытнай справы факультэта міжнародных адносін Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

**Author**:
Astroha Viktar A. – doctor of science (history), full professor, head at the department of customs, faculty of international relations of the Belarusian State University;
e-mail: ostroga.v@mail.ru

# МИНСКАЯ РЕГИОНАЛЬНАЯ ТАМОЖНЯ: СОЗДАНИЕ И ТРАНСФОРМАЦИИ (1991–2001)

*В. А. ОСТРОГА*

*Белорусский государственный университет,
пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

На основании широкого круга источников ведомственного архива Минской региональной таможни и публикаций анализируется малоисследованная страница в отечественной историографии таможенной службы Беларуси – история создания и трансформаций Минской региональной таможни в 1991–2001 гг. Определены особенности и этапы ее деятельности в рассматриваемый период, показана трансформация организационной структуры таможни, изучена эволюция основных направлений ее работы, охарактеризована деятельность начальников таможни. Представлены наиболее яркие примеры функционирования таможни как главной экспериментальной площадки таможенной службы страны. Сделан вывод о важной роли Минской региональной таможни в системе таможенных органов Республики Беларусь.

***Ключевые слова***: Республика Беларусь, таможенная служба, Минская региональная таможня, таможня, таможенники, трансформация, организационная структура, пункт таможенного оформления, борьба с контрабандой, изъятые товары, победитель соревнования.

# MINSK REGIONAL CUSTOMS: CREATION AND TRANSFORMATION (1991–2001)

*V. A. ASTROHA*

*Belarusian State University,
Nezalezhnosti Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus*

Based on a wide range of sources of the departmental archive of Minsk Regional Customs (MRT) and publications, a little-researched page in the domestic historiography of the Customs Service of Belarus is analyzed – the history of the creation and transformations of Minsk Regional Customs in 1991–2001. The features and stages of its activities in the period under review are determined, the transformation of the organizational structure of customs is described, the evolution of the main directions of its work is studied, the activities of customs' chiefs are characterized. The most striking examples of the functioning of customs as the main experimental site of the customs service of the country are presented. The conclusion about the important role of Minsk Regional Customs in the system of customs authorities of the Republic of Belarus is made.

***Keywords***: Republic of Belarus, customs service, Minsk Regional Customs, customs, customs officers, transformation, organizational structure, customs clearance point, anti-smuggling, seized goods, winner of the competition.

## Уводзіны

Мінская рэгіянальная мытня (МРМ) мае даўнюю і цікавую гісторыю, якая налічвае не адно стагоддзе. У яе мінулым было шмат рубежных падзей, што ўплывалі на далейшы лёс мытні. Такімі былі і 1990-я гг., пад час якіх яна набыла высокае званне рэгіянальнай і стала адной з найбольш эфектыўных у нацыянальнай мытнай сістэме. Але, нягледзячы на сваё мінулае, масштабы дзейнасці і асаблівы сталічны статус, гістарыяграфія МРМ мае

лічаныя публікацыі. Большасць з іх насіла публіцыстычны характар або прадстаўлена інфармацыйнымі буклетамі ці звесткамі агульнамытнай гісторыі. Сярод навуковых даследаванняў фактычна адзінай з'яўляецца праца В. А. Астрогі і С. В. Іванова "Гісторыя Мінскай рэгіянальнай мытні" (2022), у якой пададзены кароткі гістарычны нарыс [1].

Таму мэта дадзенага даследавання – раскрыць малавядомую і нявывучаную старонку мытнай службы Беларусі – гісторыю стварэння і далейшай арганізацыйнай трансфармацыі Мінскай рэгіянальнай мытні ў 1991–2001 гг. Дзеля яе дасягнення былі вызначаны наступныя задачы: выявіць асаблівасці і этапы дзейнасці мытні ў разглядаемы перыяд; ахарактарызаваць трансфармацыю арганізацыйнай структуры мытні; раскрыць эвалюцыю асноўных кірункаў яе працы і прасачыць змены кіруючага складу; падаць найбольш яскравыя прыклады функцыянавання мытні як галоўнай эксперыментальнай пляцоўкі мытнай службы краіны.

Рашэнню пастаўленых задач садзейнічала выкарыстанне шырокага кола крыніц з архіва Мінскай рэгіянальнай мытні (гістарычная даведка да фонду Мінскай мытні за 1945–1996 гг.; загады і ўказанні начальніка мытні за 1993 г.), а таксама фотаздымкі з асабістага архіву аўтара.

У працы над артыкулам аўтар прытрымліваўся прынцыпу гістарызма, які мае на ўвазе аналіз пастаўленай праблемы ў кантэксце тэндэнцый сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1990-я гг. і сістэмнасці, што азначае разгляд дзейнасці мытні ў кантэксце развіцця ўсёй мытнай сістэмы краіны. Таксама выкарыстоўваліся спецыяльныя гістарычныя метады даследавання (гісторыка-сістэмны, гісторыка-параўнальны), якія дазволілі выявіць месца Мінскай рэгіянальнай мытні ў сістэме мытных органаў Беларусі ў 90-х гг. XX ст.

## Асноўная частка

У 1991 г. Беларусь абвясціла аб сваім суверэнітэце, аб правядзенні незалежнай унутранай і знешняй палітыкі. Пачаўся працэс фарміравання ўласных органаў кіравання, інстытутаў і атрыбутаў беларускай дзяржавы – войска, праваахоўных органаў, сістэмы рэгулявання знешнеэканамічных сувязяў.

20 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь пастановай "Аб мытнай службе Рэспублікі Беларусь" стварыў Дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь (ДМК Рэспублікі Беларусь) з падпарадкаваннем яму ўсіх мытных устаноў СССР, якія існавалі на той момант на беларускай тэрыторыі. З гэтага дня пачаўся новы гістарычны этап мытнай гісторыі Беларусі – перыяд стварэння нацыянальнай мытнай службы. Першым кіраўніком мытных органаў Беларусі стаў П. В. Крэчка, былы начальнік Беларускага ўпраўлення ДМК СССР, які да таго доўгі час кіраваў Мінскай мытняй (мал. 1).

Наступны 1992 г. быў багаты на значныя падзеі для мытнага ведамства. Так, ужо 13 сакавіка быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь "Аб асновах арганізацыі мытнай службы Рэспублікі Беларусь", які заклаў прававыя падмуркі для далейшага развіцця мытнай справы і мытнай службы ў дзяржаве [2].



Мал. 1. Крэчка П. В., начальнік Мінскай мытні і Беларускай тэрытарыяльнай мытні (1975–1990), Старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь (1991–1992, 1994–1997)

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 1. Krechko, P. V., Head of Minsk Customs, Belarusian Territorial Customs (1975–1990), Chairman of the State Customs Committee of the Republic of Belarus (1991–1992, 1994–1997)

Source: from the author's collection.

Адначасова пачалася праца над стварэннем першага беларускага мытнага кодэкса. У час будаўніцтва нацыянальнай мытнай адміністрацыі імкліва развіваліся і яе найважнейшыя складнікі – мытні. З атрыманнем дзяржаўнай незалежнасці Беларусі асаблівая роля надавалася сталічнай Мінскай мытні, якая з канца 1980-х гг. ужо стала адной з ключавых у рэспубліцы.

Таму не дзіва, што 27 кастрычніка 1992 г. загадам Старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь Мінская мытня “ў мэтах найбольш якаснага і аператыўнага вырашэння пытанняў па мытным афармленні і іншых аспектах дзейнасці мытных устаноў, што ствараюцца ў розных рэгіёнах рэспублікі” была пераўтворана ў рэгіянальную з зонай дзейнасці на тэрыторыі Мінскай, Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей [3, арк. 3]. У падпарадкаванне да МРМ пераходзілі Браслаўская, Верхнядзвінская і Пастаўская мытні, а таксама новыя мытныя пасты: Бабруйскі, Салігорскі, Маладзечанскі, Мазырскі і пункты мытнага афармлення (ПМА) – “АТЭП-7”, “Калядзічы чыгуначная”, “Сцяпянка”, “АТЭП-5”, “Мінскі завод халадзільнікаў”.

Зыходзячы з пастаўленых задач, у МРМ адначасова з’явіліся новыя аддзелы: статыстыкі, матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, дзяжурнай службы і інфармацыі грамадзян. З 18 студзеня 1993 г. новую рэгіянальную мытню ўзначаліў кадравы мытнік В. В. Макарэвіч, які да гэтага кіраваў папярэдняй Мінскай мытняй (1990–1993) і працаваў у ёй з 1970 г. [1, с. 66].

Тут звернем увагу, што на гэты момант пад юрысдыкцыяй МРМ апынуліся чатыры вобласці краіны з шасці, якія ахоплівалі амаль дзве траціны рэспублікі. За ўсю сваю гісторыю мытня не валодала такой шырокай у тэрытарыяльным плане зонай адказнасці. Аднак статус мегамытні быў нядоўгі. Ужо 22 сакавіка 1993 г. мытныя пасты Віцебскі, Мазырскі, “Мінск-2” і Наваполацкі былі пераўтвораны ў самастойныя мытні. Таму зона адказнасці МРМ зноў вярнулася ў межы сталічнай вобласці [3, арк. 4].

З 1 кастрычніка 1993 г. новым кіраўніком МРМ быў прызначаны былы начальнік Упраўлення арганізацыі мытнага кантролю ДМК Рэспублікі Беларусь П. М. Кучко (мал. 2), які меў вялікі досвед кіруючай працы. Больш таго, у 1981 г. ён пачынаў сваю прафесійную кар’еру менавіта ў Мінскай мытні. У сваю чаргу В. В. Макарэвіч быў прызначаны намеснікам Старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь. П. М. Кучко ўзначальваў мытню дастаткова працяглы перыяд, да лета 1998 г. Менавіта ён стаў арганізатарам будучых дасягненняў МРМ і пакінуў прыкметны след у яе гісторыі.

У 1990-я гг. структура мытні ўвесь час ўдасканальвалася. Так, у 1993 г. у яе складзе з’явіўся новы Барысаўскі мытны пост. У складзе аддзела мытнага афармлення і кантролю № 2 меліся і такія ўнікальныя ПМА, як “Мінск-пасажырскі” (адбывалася афармленне багажу пасажыраў цягнікоў) і “Аэрапорт Мінск-1” (афармляліся грузы і пасажыры, якія перамяшчаліся паветраным транспартам). Выключна МРМ належаў і адзіны ў мытнай сістэме ПМА “Мінская пошта”, звязаны з афармленнем міжнародных паштовых адпраўленняў. Акрамя таго, на ПМА “Гандлёвы Дом Ждановічы” праводзілася мытнае афармленне асабістага аўтатранспарту фізічных асоб, а на пунктах “Сцяпянка”, “Маладзечна” і “Слуцк” – тавараў, што перамяшчаліся чыгуначным транспартам. З’яўляліся і абсалютна новыя аддзелы, стварэнне якіх было выклікана часам і новымі магчымасцямі. Напрыклад, у снежні 1993 г. у складзе мытні было сфарміравана ўнікальнае падраздзяленне для беларускай мытнай службы – аддзел мытных



Мал. 2. Кучко П. М., начальнік Мінскай рэгіянальнай мытні ў 1993–1998 гг.

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 2. Kuchko P. M., Head of Minsk Regional Customs in 1993–1998

Source: from the author’s collection.

даследаванняў і экспертыз са штатам у чатыры чалавекі [4, арк. 19].

Трэба адзначыць, што цікавым і нават характэрным сюжэтам гісторыі Мінскай мытні разглядаемага часу была яе лакацыя. Так, напачатку 1990-х гг. мытня мейсцілася ў гістарычным будынку XVII ст. на вул. Ракаўская, 4. Будынак належаў Свята-Петра-Паўлаўскаму сабору, у якім царкоўныя службы не праводзіліся з 1933 па 1991 г. МРМ займала там першы паверх, а ДМК Рэспублікі Беларусь – другі (мал. 3). Крыху пазней усе памяшканні будынка былі перададзены мытні для яе базавых аддзелаў.

У 1995 г. адбылася афіцыйная перадача царкве ўсіх прыналежных ёй будынкаў. У выніку МРМ выехала з будынку на вул. Ракаўскай, 4, і некалькі гадоў "тулілася" ў прыстасаваных памяшканнях шматпавярховага жылога будынка па адрасе пр. Партызанскі, 83. Гэта вельмі абцяжарвала працу як мытнікаў, так і яе наведвальнікаў. Затым, у 2003 г., МРМ усялілася ў будынак на вул. Камуністычная, 11, дзе размяшчаўся ДМК Рэспублікі Беларусь. Толькі 4 сакавіка 2005 г. мытня ўпершыню ў сваёй гісторыі пераехала ва ўласны будынак па адрасе вул. Магілёўская, 43, дзе зараз і знаходзіцца яе цэнтральны офіс.

У сярэдзіне 1990-х гг. перад Мінскай мытняй, як і ў цэлым перад усімі мытнымі органамі краіны, былі пастаўлены новыя важныя задачы. Сярод іх былі:

- стварэнне ўмоў, якія садзейнічаюць паскарэнню тавараабароту праз мытную граніцу Рэспублікі Беларусь;
- ажыццяўленне і ўдасканаленне мытнага кантролю;
- узаемадзеянне з органамі пагранічнага, ветэрынарнага, фітасанітарнага, радыёметрычнага і іншых відаў дзяржаўнага кантролю;
- ажыццяўленне барацьбы з кантрабандай;
- ажыццяўленне збору і апрацоўкі першапачатковых дадзеных для фарміравання мытнай статыстыкі знешняга гандлю;
- забеспячэнне правільнага выкарыстання мытных рэжымаў [3, арк. 3].

З 1996 г. арганізацыйная структура МРМ зноў зведала змены. Цяпер у яе склад уваходзілі: кіраўніцтва і 10 аддзелаў (арганізацыі мытнага кантролю; барацьбы з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі; мытных расследаванняў; тэхнічнага кантролю і сувязі; мытнай статыстыкі; кадраў; бухуліку і кантролю; мытных плацяжоў; дзяжурнай службы і інфармацыі грамадзян; юрыдычны), мытныя пасты "Мінск-1" і "Сцяпянка" [3, арк. 3]. Але пазначым, што на гэты час былі ўжо скасаваны мытныя пасты "Мачулішчы" і "Мінск-Цэнтральны" [3, арк. 4].



Мал. 3. Будынак на вул. Ракаўскай, 4, дзе напачатку 1990-х гг. знаходзілася Мінская рэгіянальная мытня

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 3. The building on Rakovskaya street 4, where Minsk Regional Customs was located in the early 1990s

Source: from the author's collection.

У 1997 г. структура мытні ўжо ўключала ў сябе 17 аддзелаў і 4 мытныя пасты (“Сцяпянка”, Барысаўскі, Салігорскі і Маладзечанскі) [3, арк. 4]. Яе структурнае развіццё працягнулася і ў наступным годзе. Напрыклад, у 1998 г. у мытні з’явіўся аддзел мытнай інспекцыі.

Трэба адзначыць, што пасля рэарганізацый у Мінскай цэнтральнай мытні ў 1997 г. частка яе функцый была перададзена МРМ. Але адначасова былі ліквідаваны і некаторыя мытныя пасты: “Сцяпянка”, “Мінск-1” і інш.

Сталае ўдасканальванне структуры дазволіла МРМ увайсці напрыканцы 1990-х гг. у групу перадавых беларускіх мытняў і стаць “вядучым падраздзяленнем беларускай сістэмы мытных органаў” [5, с. 10]. Гэта было абсалютна заслужана, бо па выніках 1997 г. з 19 дзеючых мытняў Беларусі на яе долю прыпадала амаль 40 % усіх пералічаных у даходную частку рэспубліканскага бюджэту мытных плацяжоў. Штодня МРМ давала ў скарбонку дзяржавы 25–30 млрд рублёў (925 925 долараў ЗША па курсу беларускага рубля на 1997 г.) [5, с. 10].

У гэты час мытня стала і эксперыментальнай пляцоўкай усёй нацыянальнай мытнай сістэмы, а вынікі яе асноўных вытворчых эксперыментаў актыўна выкарыстоўваліся ў дзейнасці ўсіх мытных устаноў Беларусі. Напрыклад, у 1998 г. пад кіраўніцтвам П. М. Кучко пачалася распрацоўка праекта па стварэнні ў зоне адказнасці мытні замест існуючай сеткі дробных ПМА новай сістэмы – буйных мытных тэрміналаў, аб’яднаных у адзіную інфармацыйную сетку з ДМК Рэспублікі Беларусь і шасцю профільнымі міністэрствамі [5, с. 10].

У 1990-х гг. мытныя органы, абараняючы эканамічную бяспеку краіны, таксама атрымалі і багаты досвед змагання з правапарушэннямі ў сферы знешнеэканамічнай дзейнасці. З улікам статуса МРМ яе службовыя асобы заўсёды знаходзіліся на вастрыні гэтай барацьбы. Так, у першай палове 1990-х гг. мінскія мытнікі ўважліва ажыццяўлялі кантроль за перамяшчэннем асабістай маёмасці вайскоўцаў былой Беларускай ваеннай акругі, якія вырашылі пакінуць межы Беларусі. Але яны не заўсёды былі законапаслухмянымі.

Напрыклад, у ноч з 29 на 30 снежня 1993 г. супрацоўнікі мытні старэйшы інспектар Д. П. Іванюта і стажор А. Аскерка дагледжвалі на станцыі “Сцяпянка” кантэйнер “з хатнімі рэчамі” вайскоўца Г., які накіроўваўся на новае месца службы па-за межы рэспублікі. У паводзінах афіцэра мытнікаў насцярожыла нервовасць. І невыпадкова. Калі адчынілі яго грузавы кантэйнер, то ў ім замест заяўленых хатніх рэчаў у мяшках і скрынях было схавана больш за 1000 патронаў да аўтамата Калашнікава, электрадэтанатары супрацьтанкавых мін, матрыцы для ліцця куль, аўтаматы Калашнікава і часткі да іх, самаробная зброя. “Тавар” затрымалі, а вайскоўца перадалі ў міліцыю [6, с. 6].

Вынікі працы ў супрацьдзеянні мытным правапарушэнням з кожным годам узрасталі. Так, у 2001 г. супрацоўнікамі праваахоўнага блока мытні было разгледжана 1818 спраў аб адміністрацыйных мытных правапарушэннях, узбуджана і перададзена па падследнасці чатыры крымінальныя справы. Больш чым на 26 % павялічылася колькасць выяўленых падчас спецаперацый правапарушэнняў. Кошт канфіскаваных тавараў і транспартных сродкаў склаў 1 902 398 109 беларускіх рублёў (925 761 долар ЗША па курсу беларускага рубля на 2001 г.) [7, с. 13].

Службовыя поспехі сталічнай мытні не праходзілі незаўважанымі для кіраўніцтва ведамства і краіны. МРМ неаднаразова атрымлівала ўзнагароды, а ў 2000 г. калектыў мытні быў узнагароджаны ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь [1, с. 77] (мал. 4).



Мал. 4. Намеснік Старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь І. І. Авін узнагароджвае начальніка Мінскай рэгіянальнай мытні П. М. Кучко вымпелам “За высокія паказчыкі”. 1998 г.

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 4. Deputy Chairman of the State Customs Committee of the Republic of Belarus I. I. Avin awards the Head of Minsk Regional Customs P. M. Kuchko with the pennant ”For high achievements”. 1998

Source: from the author’s collection.

З 11 студзеня 1999 г. сталічную мытню ўзначаліў А. І. Тамашэвіч, у мінулым намеснік начальніка Ашмянскай мытні, які кіраваў МРМ да 8 красавіка 2002 г. (мал. 5). Былы вайсковец, ён меў стаж мытнай службы з 1992 г. [1, с. 77].

У 2000 г., напярэдадні 10-гадовага юбілею службы, кіраўніцтва ДМК Рэспублікі Беларусь звярнула ўвагу ўсіх беларускіх мытнікаў на важнасць захавання існуючых гістарычных і новых традыцый. 17 красавіка 2000 г. быў падпісаны загад “Аб падрыхтоўцы да святкавання 10-годдзя мытнай службы Рэспублікі Беларусь”. У адпаведнасці з ім пачалася праца па распаўсюджванню сярод супрацоўнікаў ведаў гэтых традыцый. Вялікая ўвага надавалася напісанню гісторыі мытняў і стварэнню ў іх музейных экспазіцый [8, с. 4].

Да юбілейнага 2001 г. Мінская рэгіянальная мытня падышла развітай і эфектыўна дзеючай установай, якая складалася з трох мытных пастоў (Маладзечанскага, Барысаўскага і “Салігорскага”), 12 аддзелаў мытнага афармлення і кантролю, 18 аддзелаў мытні. Мытнае афармленне ажыццяўлялася на 44 ПМА. Яе штатная колькасць складала 479 чалавек. У зону дзейнасці мытні ўваходзіла тэрыторыя горада Мінска і Мінскай вобласці, дзе было зарэгістравана звыш 20 500 суб’ектаў гаспадарання, якія займаліся знешнеэканамічнай дзейнасцю. Доля МРМ у агульнай суме пералічаных у рэспубліканскі бюджэт сродкаў пастаянна павялічвалася і стабільна складала найвялікшую лічбу сярод астатніх мытняў (каля 47 % ад гадавога плана мытных органаў) [9, с. 30]. Цікава адзначыць, што на 1 рубель затрат сталічныя мытнікі ў гэты час давалі даход у бюджэт 214,8 беларускіх рублёў [7, с. 12].

У 2001 г. па выніках трох этапаў спаборніцтваў паміж мытнямі і іх структурнымі падраздзяленнямі, прысвечаных юбілею мытнай службы Беларусі, у першай групе найбольш буйных мытняў краіны калектыў мытні заняў 1-е месца. Гродзенская рэгіянальная мытня заняла 2-е месца, а знакамітая Брэсцкая мытня – 3-е месца. 20 верасня 2001 г. на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 10-годдзю мытнай службы Рэспублікі Беларусь, намеснік Старшыні ДМК Рэспублікі Беларусь І. І. Авін уручыў начальніку МРМ А. І. Тамашэвічу сцяг пераможцы спаборніцтва сярод мытняў у гонар юбілею службы, ганаровую грамату і ключы ад спецыяльнага прыза – аўтамашыны [10, с. 6] (мал. 6).



Мал. 5. А. І. Тамашэвіч, начальнік Мінскай рэгіянальнай мытні ў 1999–2002 гг.

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 5. Tamashevich A. I., Head of Minsk Regional Customs in 1999–2002

Source: from the author’s collection.




Мал. 6. Сцяг пераможцы спаборніцтва ў гонар 10-годдзя мытнай службы Рэспублікі Беларусь, уручаны калектыву Мінскай рэгіянальнай мытні. 2001 г.

Крыніца: са збораў аўтара.

Fig. 6. Minsk Regional Customs personnel was awarded with the Banner in honor of the 10th anniversary of the Customs Service of the Republic of Belarus as the competition’s winner. 2001

Source: from the author’s collection.

## Заключэнне

Такім чынам, у 1991–2001 гг. Мінская рэгіянальная мытня і яе калектыў паспяхова прайшлі ў складзе мытнай службы Рэспублікі Беларусь няпросты этап свайго станаўлення. Шматлікія структурныя рэарганізацыі зрабілі МРМ адпавядаючай тым задачам, якія ставіліся кіраўніцтвам дзяржавы перад мытнымі ўстановамі Беларусі і канкрэтна сталічным рэгіёнам. Яе вытворчыя пляцоўкі з канца 1990-х гг. усё часцей станавіліся эксперыментальнымі ў масштабах усёй мытнай службы краіны. Адным з найбольш гучных праектаў у той перыяд было стварэнне ў зоне адказнасці мытні сістэмы буйных мытных тэрміналаў, аб'яднаных у адзіную інфармацыйную сетку з ДМК Рэспублікі Беларусь і шасцю профільнымі міністэрствамі. Роля Мінскай рэгіянальнай мытні ў сістэме мытных органаў Рэспублікі Беларусь на той час пастаянна павышалася, і на 2001 г. яна зарэкамендавала сябе вядучай і эфектыўнай мытнай установай краіны.

## Спіс бібліяграфічных спасылак

1. Острога, В. А. *История Минской региональной таможни* / В. А. Острога, С. В. Иванов. – Минск : РИВШ, 2022. – 172 с.
2. *Об основах организации таможенной службы Республики Беларусь* [Электронны рэсурс] : Закон Респ. Беларусь, 13 марта 1992 г., № 1520-XII // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2023.
3. *Архіў Мінскай рэгіянальнай мытні* (далей – Архіў МРМ). – Ф. 1. Мінская рэгіянальная мытня. – Воп. 2. Историческая справка к фонду Минской таможни с 18.06.1945 г., Минского таможенного поста с 29.03.1965 г., Минской таможни с 05.04.1987 г., Минской таможни с 15.06.1990 г., Минской региональной таможни с 27.10.1992 г., за 1945–1996 гг. – 16 л.
4. *Архіў МРМ*. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр. 58. Приказы и указания начальника таможни. 1993 г. – 87 л.
5. Косенков, Г. Секрет успешной деятельности в компьютеризации / Г. Косенков // *Таможен. вестн*. – 1997. – № 7. – С. 10–13.
6. Сабадаш, С. Честь мундира / С. Сабадаш // *Таможен. вестн*. – 1998. – № 10–11. – С. 3–6.
7. Палеев, В. Ответственность на всех одна / В. Палеев // *Таможен. вестн*. – 2002. – № 2. – С. 13.
8. Комаренко, И. Таможенники – творческие люди / И. Комаренко // *Таможен. вестн*. – 2001. – № 9. – С. 3–4.
9. 10 лет таможенной службе Беларуси // *Таможен. вестн. Спец. вып*. – Минск : [Б. и.], 2001. – 40 с.
10. Комаренко, И. Таможенная служба состоялась / И. Комаренко // *Таможен. вестн*. – 2001. – № 10. – С. 3–6.

## References

1. Ostroga, V. A., Ivanov S. V. *Istoriya Minskoj regional'noj tamozhni* [History of Minsk Regional Customs]. Minsk: RIVSH, 2022. 172 p. Russian.
2. *Ob osnovah organizacii tamozhennoj sluzhby Respubliki Belarus'* [Organizational basics of the Customs service of the Republic of Belarus] [Electronic resource]: Law of the Rep. of Belarus. March 13, 1992, No. 1520-XII // ETALON. Legislation of the Republic of Belarus / Nat. center of legal information of the Rep. of Belarus]. Minsk, 2023. Russian.
3. *Arhiu Minskaj regiyanalnaj mytni* [Archive of Minsk Regional Customs]. F. 1. Minskaya regional'naya tamozhnya [Minsk Regional Customs]. Inven. 2. Istoricheskaya spravka k fondu Minskoj tamozhni s 18.06.1945 g., Minskogo tamozhennogo posta s 29.03.1965 g., Minskoj tamozhni s 05.04.1987 g., Minskoj tamozhni s 15.06.1990 g., Minskoj regional'noj tamozhni s 27.10.1992 g., za 1945–1996 gg. [Historical reference to the fund of Minsk customs from 06/18/1945, Minsk customs post from 03/29/1965, Minsk customs from 04/05/1987, Minsk customs from 06/15/1990, Minsk Regional Customs from 10/27/1993, for 1945–1996]. 16 s. Russian.
4. *Arhiu Minskaj regiyanalnaj mytni* [Archive of Minsk Regional Customs]. F. 1. Inven. 1. Case 58. Prikazy i ukazaniya nachal'nika tamozhni. 1993 g. [Orders and instructions of the chief of customs]. 1993 g. 87 s. Russian.
5. Kosenkov, G. Sekret uspeshnoj deyatel'nosti v komp'yuterizacii [The secret of successful activities in computerization]. *Tamozhennyj vestnik* [Customs Bulletin]. 1997. No. 7. P. 10–13. Russian.
6. Sabadash, S. Chest' mundira [Esprit de corps]. *Tamozhennyj vestnik* [Customs Bulletin]. 1998. No. 10–11. P. 3–6. Russian.
7. Paleev, V. Otvetstvennost' na vsekh odna [Responsibility for all is one]. *Tamozhennyj vestnik* [Customs Bulletin]. 2002. No. 2. P. 13. Russian.
8. Komarenko, I. Tamozhenniki – tvorcheskie lyudi [Customs officers are creative people]. *Tamozhennyj vestnik* [Customs Bulletin]. 2001. No. 9. P. 3–4. Russian.
9. 10 let tamozhennoj sluzhbe Belarusi [10 years of the Customs service of Belarus]. *Tamozhennyj vestnik. Special'nyj vypusk*. [Customs Bulletin. Special issue]. Minsk: [B. i.]. 2001. 40 p. Russian.
10. Komarenko, I. Tamozhennaya sluzhba sostoyalas' [The customs service has been realized]. *Tamozhennyj vestnik* [Customs Bulletin]. 2001. No. 10. P. 3–6. Russian.

*Статья поступила в редколлегию 12.04.2023*
*Received by editorial board 12.04.2023*